**Н.У. Кашлач (Мінск)**

## Духоўныя выдаткі ўрбаністычнай цывілізацыі (на матэрыяле вершаў Людміла Рублеўскай)

Французскі пісьменнік Ф. Марыяк некалі назваў Парыж “населенай адзінотай”. Праблемы духоўнай адзіноты і адчужанасці чалавека ў сучасным горадзе, вымірання народнай культуры, адсутнасці маральных арыенціраў уздымалі многія мастакі слова, у тым ліку і сучасная беларуская паэтка Л. Рублеўская. Шматлікія ўрбаністычныя вершы Л. Рублеўскай (“Гарадскія дзеці”, “Гарадскі раманс”, “Гарадская зіма”, “Гарадская восень”, “Начны горад” і інш.) прасякнуты элегічным настроем. У іх на фоне колазвароту розных пор года адлюстроўваецца жыццё горада ў век высокіх тэхналогій, імкненне гараджан да адасобленага і замкнёнага жыцця, што, на думку паэткі, можа прывесці да духоўнага апакаліпсісу.

Мінорныя ноты адчувальныя ў многіх лірычных творах на тэму ўрбанізму. Так, у вершы “Гарадская восень” сумны настрой ствараецца праз апісанне асенняга пейзажу: “Ліхтарамі разбітымі вецер рыпіць, як касцямі / Канакрада на вісельні” [1, с. 105]. На вуліцах сярод паламаных лавак, каменных манументаў, разбітых ліхтароў пануе цемра, а горад асацыіруецца ў паэткі з чорнай вадой. У гэтай гаме цёмных фарбаў і змрочных “цывілізацыйных” вобразаў светлым выглядае вобраз прыроды, у якой Л. Рублеўская бачыць ачышчальную сілу. Лісце параўноўваецца з анёламі, а восень, хоць і выступае “песняй самоты”, але малюецца не чорнай, а жоўтай: “Адляцелі буслы – і нябёсы – пусцей за вітрыны, / І лісты, як анёлы, лятаюць над чорнай вадой” [1, с. 105]. У вершы “Гарадская зіма” ўрбаністычная стыхія паказваецца тужліва-прыгожай. Надыход зімы толькі абвастрае адзіноту лірычнай гераіні, падкрэслівае душэўны холад людзей: “Мне не страшна, мне толькі сябе шкада, / Адзіноту сваю на свеце – / Гэту пошасць прыносіць заўжды зіма, / Барадой намятае вецер” [1, с. 93]. Прычына ў тым, што ідучы па шматлюднай вуліцы, яна не можа знасці для сябе роднага чалавека – заўважае, што людзі сталі адасобленымі, чужымі адзін аднаму: “А ніхто не заўважыць – ці плачу я, / Паміраю, ці бачу Бога” [1, с. 93]. Але на пытанне – чаму ж так? – хутка знаходзіць адказ: “Гэта нашага часу такі закон, / Гэта Час халадоў звычайны” [1, с. 93].

У вершы “Гарадскія дзеці” ўдымаецца праблема будучых пакаленняў, якая раскрываецца ў цеснай сувязі з праблемай забыцця народнай культуры ва ўрбанізаваным грамадстве. Л. Рублеўская разважае над ходам далейшага развіцця ўрбанхваробы, калі горад трансфармуе свядомасць людзей, што прыводзіць да паступовага адрыву нашчадкаў ад “роднага карэння”, да забыцця мовы, народных звычаяў: “Казкі «на беларускай» маці вам не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

купляюць, / І пад час адпачынку ў замкі не павязуць. / І вам ужо не пабачыць, як піва наварыць заяц, / І як каза калядуе, ніколі вам не пачуць” [1, с. 112]. Гарадскіх дзяцей Л. Рублеўская называе сівымі гномамі, у якіх не тое дзяцінства, і вочы не тыя, і гульні не тыя, і вучаць іх не таму: “Гуляеце вы ў дзяцінства – здаецца мне зрэдку так. / І сумныя вашы вочы, і жорсткія вашы гульні / Шкадобу не выклікаюць, хутчэй – трывогу і страх...” [1, с. 112]. Такое выхаванне прывядзе да кардынальнай змены ўнутранага свету людзей, і гэта небеспадстаўна выклікае ў паэткі пацуццё душэўнага болю і замяшання – а што далей? “Вы сёння ў дварах ламалі бясплотныя цельцы клёнаў, / А заўтра зможаце знішчыць адной пастановай – парк” [1, с. 112]. Верш заканчваецца думкай пра лёс беларускай мовы, якая паўстае ў вобразе ліры, што не павінна змаўкаць.

Забыццё гараджанамі беларускай мовы Л. Рублеўская лічыць сімптомам духоўнай смерці – у яе вершах узнікае вобраз чалавека-чужаніцы, які не разумее мову продкаў, цураецца яе: “Мы – як чужынцы на вуліцах нашых. / Дзе, і ў каго, і пра што ні спытай – / Па-беларуску ніхто не адкажа. / Хочаш, каб слухалі – мову мяняй. / Мы – як чужынцы. Нас не разумеюць / Ні кіяскёры, ні культпрацаўнік. / Па-беларуску гаворыш – падзея / Для мінчука, што ад мовы адвык” [1, с. 118]. Аднак паэтка бачыць выйсце і прапануе “лекі” ад нацыянальнага бяспамяцтва, якія дапамогць народу самазахавацца: “Што ж нам рабіць? Мове роднай вучыцца! / Мова памрэ, а за ёю – народ” [1, с. 118]. Моўнае пытанне востра ставіцца і ў вершы “Ноч. Вуліца. Ліхтар. Аптэка”. Фразай “Слова «Часопіс» ня ведае кіяскёрка. / Шыльда двухмоўная крывіцца над аптэкай” яна паказвае, што на справе білінгвізм абярнуўся амаль поўным выцясненнем беларускай мовы з гарадскога асяродку. У “Гарадскім рамансе” Л. Рублеўская разважае пра ўрбаністычныя псеўдакаштоўнасці, калі “храмы руйнуюцца дзеля / Любавання бетоннай сцяною” [1, с. 114]. У апошняй страфе гучыць папярэджанне пра магчымасць духоўнай смерці горада (у вузкім сэнсе), краіны і народа з яго гісторыяй і культурай (у шырокім).

Такім чынам, Л. Рублеўскую хвалюе праблема духоўнай недасканаласці ўрбаністычнай цывілізацыі, якая вядзе да адчужанасці людзей, да адмірання культурных традыцый. Побытавая камфортнасць горада не можа падмяніць духоўнасці, кампенсаваць маральныя страты.

Літаратура

1. Рублеўская, Л. Замак месячнага сяйва : вершы / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 126 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ